Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
16 СНЕЖНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 243 (28353)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Прэзідэнт зацвердзіў Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады**
СТАР. 2



**Жывая гісторыя ў кіно**
СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**
**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Мікалай ШАРСТНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама:**

*«Усе мы родам з дзяцінства і памятаем, што такое навагоднія падарункі, як мы іх чакалі. Дзецям трэба стварыць настрой, важна не забыцца ні пра адно дзіця. Асабліва гэта тычыцца праблемных сем'яў, дзяцей, якія знаходзяцца ў інтэрнатах, выхоўваюцца без бацькоў. Да акцыі «Нашы дзеці» трэба максімальна прыцягваць спонсараў. Мы павінны зрабіць так, каб дзеці памяталі пра свята да наступнага Новага года».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9749 | ▲ |
| Еўра | 2,0710 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0320 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0751 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
16243

# Нас старасць не дагоніць!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Даніїл і Ларыса, — проста, не пажадаўшы назваць прозвішча, прадставіліся нашаму фотакарэспандэнту Анатолю Клешчуку гэтыя незвычайныя лыжнікі, калі ён сустрэў іх у сталічным Лошыцкім парку. Сярод іншых аматараў здаровага ладу жыцця гэтая сямейная пара выглядала сціпла — ніякіх табе мадэрнавых спартыўных касцюмаў і новенькіх лыжаў. Але адчувалася, што спартыўная выпраўка ў гэтых, далёка не маладых людзей, яшчэ тая — на лыжнай трасе Ларыса не адставала ад свайго Даніїла. Відаць, у жыцці ў гэтай сям'і ўсё робіцца разам, як у адной камандзе.

## ■ Ліст у рэдакцыю



# МАРНАЯ МЭТА?
### або Няспраўджаная мара радыёаматара са стажам

**На працягу больш дзясятка гадоў мяне нават сваякі ўспрымалі як «голас з радыё», бо кожную раніцу ў 06.40 па абласным праваднын вяшчанні мой голас будзіў народ: «Добрай раніцы, Гомельшчына! У эфіры праграма «Світанак», каля мікрафона Ірына Асташкевіч». У тыя зусім нядаўнія часы радыёпрыёмнік на кухні быў звычайным і нават неабходным дэвайсам. Дарэчы, і вяшчаў ён у многіх кватэрах бесперапынна з 6.00 да 24.00.**

### Хвалі і «прыбабахі»

Пра што гэта я? Які такі дэвайс? Такога англійскага слова *(device* — прылада, прыбор) ніхто не чуў, тым больш не ведаў, што яно абазначае. Дык вось, мяне настальгія зусім не мучыць, хачу вас запэўніць. У мяне, як і амаль ва ўсіх, радыё сёння ўключаецца па неабходнасці з мабільніка ці ў машыне. Але ж трэба ўлічваць, што сярод тэхнічна дасведчаных усё ж засталіся тыя, у каго лад жыцця значна парушыўся са знікненнем у доме звычайнага радыёпрыёмніка, які ў фонавым рэжыме нешта вяшчаў.

Трансляцыя са стацыянарных радыёкропак у Беларусі прыпынілася сёлета 1 жніўня. Да гэтага акта ў краіне рыхтаваліся, і нават загадзя. У тым ліку закупілі пэўную колькасць радыёпрыёмнікаў, якія сталі прадаваць праз філіялы «Белтэлекама». Канешне, іх можна было набыць і ў іншых месцах, але ж там былі самыя танныя — «МЭТА 212» беларускай вытворчасці менш чым за 20 новых рублёў. Што немалаважна для той катэгорыі людзей, якой яны больш за ўсё патрэбны, — пенсіянерам. Набыць і асвоіць сучасныя складаныя прыборы многім аказалася проста не пад сілу.

Дарэчы, сярод такіх людзей і мая маці, якая аддае перавагу інфармацыйным праграмам, меладычнай музыцы і спакойным галасам у эфіры. А яшчэ, як і многія людзі ў паважаным узросце, яна любіць браць прыёмнік на дачу і пад яго «акампанемент» праполваць бульбу.
СТАР. 4

## ■ Надвор'е

# То плюс, то мінус
### Аднак у сярэдзіне наступнага тыдня сіноптыкі абяцаюць пахаладанне да мінус 18 градусаў

**Са снегам сёлета нашай краіне пашанцавала, паведамляе галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана РЫБАКОВА.**

У выхадныя надвор'ем у Беларусі пачнуць кіраваць атмасферныя франты, якія змяшчаюцца з Балтыйскага мора. Таму ў суботу пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу. Месцамі чакаецца туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы ад мінус 1 да мінус 8 градусаў, пры праясненнях да 11 марозу. Удзень будзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. У нядзелю чакаецца кароткачасовы мокры снег. У асобных раёнах магчымы слабыя туман і галалёд, на дарогах галалёдзіца. Уначы 1—8 марозу, удзень — ад мінус 3 градусаў да 2 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак умовы надвор'я амаль не зменяцца. Пройдзе кароткачасовы снег. Уначы ад 0 да мінус 6 градусаў, а ўдзень — ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. У аўторак стане халадней. Пройдзе кароткачасовы снег. Уначы мінус 2—9 марозу, пры праясненнях — да мінус 12 градусаў. Удзень чакаецца ад 0 да мінус 7 градусаў. Сапраўды халодныя суткі сіноптыкі абяцаюць у сераду, калі надвор'ем ізноў пачне кіраваць зона павышанага атмасфернага ціску. У асобных раёнах магчымы невялікі снег. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—14 марозу, а пры праясненнях — да мінус 18 градусаў. Нават удзень прагназуецца ад мінус 3 да мінус 10 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ЗВЯЗДА
*Да чытача з любоўю!*
**ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,**
**5 разоў на тыдзень!**
**Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!**
**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# План на пяцігодку

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады. Праграма падрыхтавана ўрадам на базе асноўных яе палажэнняў, ухваленых раней пятым Усебеларускім народным сходам.**

У дакументе дадзена ацэнка развіцця нацыянальнай эканомікі ў 2011—2015 гадах, сфармуляваны мэты, задачы, прыярытэты і чаканыя вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў 2016—2020 гадах.

Нараўне з захаваннем пераемнасці курсу і базавых асноў беларускай мадэлі развіцця вызначаны новыя інструменты і механізмы рэалізацыі эканамічнай палітыкі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

Павышэнне якасці жыцця насельніцтва на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі, прыцягнення інвестыцый і інавацыйнага развіцця вызначана Праграмай як галоўная мэта развіцця Беларусі. Для яе дасягнення ўстаноўлены актуальныя пры існуючых глабальных тэндэнцыях прыярытэты, на рэалізацыі якіх будуць сканцэнтраваны ўсе ўнутраныя і знешнія рэсурсы, скіравана работа ўсёй вертыкалі ўлады.

Па-першае, гэта інвестыцыі — як крыніца тэхналагічнага абнаўлення базавых і фарміравання новых інавацыйных галін эканомікі.

Па-другое, эфектыўная занятасць на новых рабочых месцах з высокай прадукцыйнасцю — як сродак выкарыстання працоўнага патэнцыялу і сацыяльнай стабільнасці.

Па-трэцяе, экспарт — як галоўны пункт прыкладання намаганняў для збалансаванага эканамічнага развіцця.

Асновай росту канкурэнтаздольнасці будзе інавацыйнае развіццё, фінансавае аздараўленне рэальнага сектара эканомікі, зніжэнне ўсіх відаў выдаткаў, павышэнне ўкладу малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. Гэта непасрэдна звязана з прыярытэтамі пяцігодкі «Інфарматызацыя» і «Моладзь».

Інфарматызацыя ўнясе сістэмны ўклад у развіццё высокатэхналагічнага сектара эканомікі, пераход да лічбавай эканомікі, фарміраванне спрыяльнага інстытуцыйнага і бізнес-асяроддзя.

Менавіта маладое пакаленне заклікана адыграць вырашальную ролю ў пераходзе Беларусі ад індустрыяльнага да інавацыйнага шляху развіцця, эканомікі ведаў. Таму Праграмай прадугледжваецца комплекснае пашырэнне мер падтрымкі моладзі.

У дакуменце таксама змяшчаюцца канкрэтныя галіновыя задачы, пры гэтым акцэнт зроблены на паскоранае фарміраванне новых высокатэхналагічных сектараў эканомікі.

Акрамя таго, задаецца вектар развіцця рэгіёнаў, падкрэсліваецца ўзрастанне іх ролі праз фарміраванне цэнтраў росту. Раскрываюцца меры інвестыцыйнай, інавацыйнай, бюджэтна-падатковай, грашова-крэдытнай і знешнеэканамічнай палітыкі.

Захоўваецца сацыяльная накіраванасць эканамічнай палітыкі. Для грамадзян забяспечваюцца даступнасць паслуг аховы здароўя, адукацыі, навукі, культуры і спорту незалежна ад месца іх пражывання. Узмоцніцца адраснасць і мэтавы характар дзяржаўнай падтрымкі.

Будуць прынятыя меры і па стрымліванні кошту квадратнага метра жылля, які ў 2020 годзе павінен адпавядаць сярэдняй заработнай плаце па краіне.

Павышэнне сацыяльнай абароненасці работнікаў плануецца забяспечыць за кошт штогадовага ўстанаўлення памеру мінімальнай заработнай платы на ўзроўні мінімальнага спажывецкага бюджэту ў сярэднім на аднаго члена сям'і з чатырох чалавек.

Акрамя таго, вызначаны новыя інструменты і механізмы рэалізацыі эканамічнай палітыкі. Сярод іх неабходна вылучыць разняволенне дзелавой ініцыятывы, удасканаленне адносін уласнасці, кантрольнай дзейнасці і стварэнне рэальных умоў па паляпшэнні вядзення бізнесу.

У мэтах выканання пастаўленых Праграмай задач урадам будзе распрацаваны Комплекс мер па яе рэалізацыі, які ахоплівае ўсе напрамкі эканамічнай і сацыяльнай палітыкі. Рэалізацыя запланаваных мерапрыемстваў забяспечыць структурнае ўдасканаленне і павышэнне канкурэнтаздольнасці эканомікі, устойлівы эканамічны рост на збалансаванай аснове.

У прыватнасці, тэмп росту валавога ўнутранага прадукту за пяцігоддзе прагназуецца ў дыяпазоне 112,1—115%. Гэта больш чым у два разы вышэй у параўнанні з мінулай пяцігодкай (105,9%). Інфляцыя як пакасчык унутранай збалансаванасці да канца пяцігодкі не перавысіць 5%, пакасчык знешняй збалансаванасці — сальда знешняга гандлю — пачынаючы з 2017 года прагназуецца ўстойліва станоўчым.

Адначасова тэмп росту рэальных наяўных грашовых даходаў насельніцтва ў 2020 годзе па адносінах да 2015 года складзе 109,5—111,6%.

## Аптымізацыя праваахоўных і сілавых ведамстваў працягнецца

**Адпаведнае даручэнне даў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Станіслава Зася.**

У час сустрэчы было адзначана, што рыхтуецца пакет прапаноў па аптымізацыі структуры Міністэрства ўнутраных спраў. Абстаноўка, якая складваецца ў краіне, робіць магчымай працу па гэтым кірунку. У прыватнасці, амаль на 13% у параўнанні з папярэднім годам скарацілася колькасць дарожна-транспартных здарэнняў і колькасць загінулых у выніку аварый. Зафіксавана станоўчая дынаміка і ў сферы барацьбы са злачыннасцю: на 13,7% у параўнанні з мінулым годам знізілася колькасць крыміналу, звязанага з незаконным абаротам наркотыкаў, скарачаецца колькасць крадзяжоў і злачынстваў у сельскай мясцовасці. Дадзеная статыстыка дазваляе ставіць пытанне аб аптымізацыі сіл і сродкаў, якія задзейнічаны ў забеспячэнні бяспекі грамадзян. Разам з тым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што праца ў гэтым напрамку павінна весціся паэтапна і выверана, сітуацыю неабходна трымаць пад кантролем.

## Узровень беларуска-іранскага супрацоўніцтва неабходна значна павысіць

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Ісламскай Рэспублікі Іран у Беларусі Махамадам Рэза Сабуры з нагоды завяршэння яго дыпламатычнай місіі ў краіне.**

Падкрэсліўшы, што Беларусь надае вялікае значэнне супрацоўніцтву з Іранам, Прэзідэнт нашай краіны адзначыў: будучы 2017 год стане вызначальным у адносінах. «Узровень нашага супрацоўніцтва не проста важае быць лепшым. А калі суаднесці гэты рэальны ўзровень супрацоўніцтва з нашымі магчымасцямі, — ён ніякі. Наперадзе чакаецца велізарная работа», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Разам з тым кіраўнік дзяржавы заўважыў, што бакі зрабілі нямала. У прыватнасці, распрацавана дарожная карта двухбаковага супрацоўніцтва на 2016—2017 гады. «Калі Беларусь і Іран рэалізуюць хаця б палавіну магчымасцей дзвюх краін, гэта будзе самы эфектыўны праект супрацоўніцтва. Вы маеце патрэбу ва ўсім, што ў нас ёсць, што мы вырабляем. Мы маем вялікую патрэбу ў таварах, што ёсць у вас. Давайце разам працаваць, ствараць сумесныя прадпрыемствы тут, у Іране, давайце, нарэшце, пакажам, што мы можам супрацоўнічаць».

# Прэзідэнт разгледзеў кадравыя пытанні

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

**Кіраўнік дзяржавы прызначыў:**

КАРПЕНКУ Ігара Васільевіча — міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь;

МАЛАШКУ Валерыя Анатольевіча — міністрам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь;

КУРЛЫПУ Аляксандра Міхайлавіча — намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь;

КУХАРАВА Уладзіміра Яўгенавіча — намеснікам старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь;

ГЕРАСІМАВА Васіля Мікалаевіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па Брэсцкай вобласці;

ІСАЧАНКУ Анатоля Міхайлавіча — памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўным інспектарам па Мінскай вобласці;

КУПЧЫНУ Алену Мікалаеўну — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Аўстрыйскай Рэспубліцы, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры міжнародных арганізацыях у Вене, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Харватыя па сумяшчальніцтве;

ПАДГУРСКАГА Івана Мікалаевіча — першым намеснікам міністра ўнутраных спраў — начальнікам крымінальнай міліцыі;

ГОШЫНА Уладзіміра Анатольевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы, Рэспубліцы Саюз М'янма і Каралеўстве Тайланд па сумяшчальніцтве;

КУПТЭЛЯ Дзмітрыя Георгіевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Аб'яднанай Рэспубліцы Танзанія па сумяшчальніцтве;

ЛАТУШКУ Паўла Паўлавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Княстве Манака па сумяшчальніцтве, Пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Сусветнай турысцкай арганізацыі па сумяшчальніцтве.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на прызначэнне:**

КАНЮШКІ Андрэя Васільевіча — намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама;

ПАЎЛЕЧКІ Алены Фёдараўны — старшынёй Мазырскага райвыканкама;

АСЛЮКА Ігара Святаславіча — старшынёй Чачэрскага райвыканкама;

КРАЎЧАНКІ Алега Іванавіча — намеснікам міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь;

ГАЎРЫЧЭНКІ Мікалая Іванавіча — рэктарам установы адукацыі «Віцебская ордэна "Знак Пашаны" дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны»;

ЯРАШЭНКІ Аляксандра Рыгоравіча — кіраўніком дзяржаўнай установы «Адміністрацыя Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парку "Індустрыяльны парк "Вялікі камень"»;

СУШЧЫНСКАГА Вадзіма Валянцінавіча — пракурорам Віцебскай вобласці;

КОРЗУНА Віктара Канстанцінавіча — пракурорам Гродзенскай вобласці;

КАРЛЮКЕВІЧА Аляксандра Мікалаевіча — намеснікам міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь;

СТАРАВОЙТАВА Мікалая Міхайлавіча — намеснікам міністра юстыцыі Рэспублікі Беларусь;

СУХАРУКАВА Паўла Якаўлевіча — дырэктарам — галоўным рэдактарам рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

Звяртаючыся да Ігара Карпенкі, які прызначаны міністрам адукацыі, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што перад ім стаіць шмат задач па развіцці сферы адукацыі і рашэнні розных праблемных пытанняў. У тым ліку гаворка ідзе аб далейшай рэалізацыі пэўнай канцэпцыі, удасканаленні навучальных праграм. «На жаль, мае ўстаноўкі не ў поўным аб'ёме рэалізаваны ў адукацыі. І вам усё гэта трэба будзе рэалізаваць», — адзначыў Прэзідэнт.

Выбар на карысць Валерыя Малашкі пры прызначэнні яго міністрам працы і сацыяльнай абароны быў зроблены ў тым ліку таму, што ён у большай ступені бачыць тыя ці іншыя праблемы і недахопы на нізавым узроўні, штодня з імі працуе. «Гэта міністэрства павінна ўзначаліць сур'ёзнае ўдасканаленне ўсіх напрамкаў дзейнасці. У нас самая вялікая праблема тут — незадаволенасць людзей па пэўных пытаннях», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт у прыватнасці звярнуў увагу на такія пытанні, як узровень заработнай платы, удасканаленне пенсійнай сістэмы і іншыя сацыяльныя рашэнні.

Асобныя даручэнні дадзены кіраўніцтву КДК. «Камітэт дзяржаўнага кантролю павінен быць эфектыўна дзеючай структурай, — падкрэсліў беларускі лідар. — Я ўсё часцей чую, што і бюракратызм нас заядае, занадта шмат лішніх хаджэнняў па прадпрыемствах. І КДК павінен з Адміністрацыяй Прэзідэнта гэта бачыць».

Канкрэтныя задачы пастаўлены і перад новымі кіраўнікамі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Яны датычацца развіцця прадпрыемстваў, вызначэння стратэгіі па асобных напрамках у сельскай гаспадарцы. У звязку з кіраўнікамі рэгіёнаў павінны працаваць і памочнікі Прэзідэнта — галоўныя інспектары па абласцях, паставіў задачу Прэзідэнт.

Асаблівы акцэнт Аляксандр Лукашэнка зрабіў на неабходнасці развіцця індустрыяльнага парка «Вялікі камень», адміністрацыю якога ўзначаліць Аляксандр Ярашэнка, які раней займаў пасаду намесніка міністра эканомікі. «Парк «Вялікі камень» — гэта высокія тэхналогіі. Нам склады там не патрэбны. Там павінны працаваць высокага ўзроўню прадпрыемствы з любой краіны», — дадаў Прэзідэнт.

Падчас прыняцця кадравых рашэнняў размова таксама вялася пра важнасць далейшай працы па дэбюракратызацыі, ліквідацыі залішняга ціску на вытворчасць і бізнес. «Мы неўзабаве прымем вельмі сур'ёзныя рашэнні. Ужо дамовіліся ў Адміністрацыі Прэзідэнта (кіраўніцтва будзе ў бліжэйшы час сфарміравана), што вернемся да пытанняў дэбюракратызацыі і лішніх праверак на месцах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Адначасова, паводле слоў Прэзідэнта, мяркуецца па адпаведных напрамках павысіць адказнасць кіраўнікоў суб'ектаў гаспадарання.

Пры прызначэнні на дыпламатычныя пасады кіраўнік дзяржавы закрануў тэму развіцця адносін Беларусі з ЗША. «Мы сваю пазіцыю заявілі — гэта імперыя, вядучая краіна ў свеце, і мы павінны з імі мець добрыя адносіны. Але бегчы наперадзе паравоза і абяцаць тое, што мы ніколі не зробім, ні ў якім разе нельга, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Напрамак выбудоўвання з імі адносін вызначаны. Трэба па гэтым шляху ісці».

Прымаючы кадравыя рашэнні, Прэзідэнт Беларусі асабліва падкрэсліў тую ўвагу, якая надаецца падбору кіруючых кадраў. Усе кандыдатуры падрабязна абмяркоўваліся і разглядаліся на прадмет як прафесійных, так і асабістых якасцяў.

## Біяграфія Малашкі В.А.



**Малашка Валерый Анатольевіч нарадзіўся ў 1966 годзе ў Гродне. Скончыў у 1989 годзе Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, у 2007 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

З 1989 года працаваў урачом-інтэрнам па анестэзіялогіі і рэаніматалогіі Магілёўскай абласной бальніцы, з 1990-га па 1993 год — урачом-анестэзіёлагам-рэаніматолагам Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы. З 1993-га па 1997 год — намеснік галоўнага ўрача па лячэбных пытаннях Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы. У 1997—2004 гадах займаў пасаду галоўнага ўрача Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы.

З 2004 года быў першым намеснікам начальніка ўпраўлення аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама. З 2005-га па 2009 год — начальнік упраўлення аховы здароўя Магілёўскага аблвыканкама.

З 2009 года да гэтага часу працаваў намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама.

## Біяграфія Карпенкі І.В.

**Карпенка Ігар Васільевіч нарадзіўся ў 1964 годзе ў Новакузнецку Кемераўскай вобласці Расійскай Федэрацыі. У 1989 годзе скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.М. Горкага, у 2008 годзе — Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**



У 1982—1984 гадах служыў у радах Савецкай Арміі на тэрыторыі Чэхаўскага раёна Маскоўскай вобласці.

З 1989-га па 1993 год быў сакратаром камітэта камсамола, начальнікам аддзела выхаваўчай работы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага.

У 1993—1995 гадах — начальнік аддзела выхаваўчай работы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. З 1995-га па 2001 год займаў пасаду начальніка аддзела выхаваўчай работы, начальніка ўпраўлення выхаваўчай работы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка. У перыяд 2001—2003 гадоў быў начальнікам упраўлення выхаваўчай работы БДПУ, у 2003—2004 гадах — прарэктар па выхаваўчай і сацыяльнай рабоце.

З 2004-га па 2008 год з'яўляўся членам Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі.

У 2008—2011 гадах — намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

З 2011 года да гэтага часу займаў пасаду намесніка старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

БПС-СБЕРБАНК

## Результаты рекламной игры

### «Получи больше с платежной карточкой MasterCard БПС-Сбербанка»

Организатор рекламной игры - Общество с ограниченной ответственностью «Смарт Нова», 220002, г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, к. 11. Рекламная игра «Получи больше с платежной карточкой MasterCard БПС-Сбербанка» проводилась на территории Республики Беларусь. Срок начала рекламной игры – 1 июля 2016 года, срок окончания – 26 декабря 2016 года. Свидетельство о государственной регистрации № 2788, выданное Министерством торговли Республики Беларусь «22» июня 2016г. В рекламной игре участвовало 51 250 человек. Призовой фонд разыгран полностью.

Победители рекламной гры:

1. Гойдь М.А. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел.рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 8.12.2016г.
2. Римашевский А.М. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел.рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 8.12.2016г.
3. Анкуда В.С. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел.рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 8.12.2016г.
4. Клим А.Ф. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел.рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 13.10.2016г.
5. Муца Н.В. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел.рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 13.10.2016г.
6. Таракан Н.М. выигрыш телефон iPhone 6s 64Gb и денежные средства в размере 300 бел.рублей образца 2009 года/ 3 000 000 бел. рублей. Приз вручен 13.10.2016г.

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры 8(029)6208673.

УНП 191720959

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | капитальное строение, инв. № 400/С-12047 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание), площадью 124,7 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина |
| Земельный участок, на котором расположен объект | кадастровый номер 422086505101001109 (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания административного здания), площадью 0,0324, расположенный по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2 |
| Начальная цена продажи | 40 951 р. (сорок тысяч девятьсот пятьдесят один рубль) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 4 095 р. (четыре тысячи девяносто пять рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб.209, тел. 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 26 декабря 2016 г. в 10.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом-резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица - доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 27.10.2015 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник - четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 21 декабря 2016 г. до 15.00.**

*Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*

■ Віншуем!

# Беларускаму саюзу жанчын — 25!

**За чвэрць стагоддзя саюз праявіў сябе як згуртаваная арганізацыя, якая набыла вялікі вопыт аказання дапамогі жанчынам, сем'ям і дзецям і абароны іх інтарэсаў. 25 гадоў — узрост сталасці і вопыту. Арганізацыя напоўнена сіламі, жаданнем актыўна працаваць і падтрымліваць жанчын на ўсіх узроўнях, рэалізоўваць новыя творчыя сацыяльныя праекты.**

Арганізацыя аб'ядноўвае жанчын розных сацыяльных груп з рознымі патрэбамі і надзеямі. Аднак для любой жанчыны галоўнае — мір, сям'я і ўпэўненасць у будучым, і мы актыўна садзейнічаем стварэнню і захаванню гэтых каштоўнасцей, зазначылі ў БСЖ. У саюзе стварыліся свае традыцыі, склаліся пэўныя формы работы, праводзяцца пастаянныя акцыі. Традыцыйна ў сакавіку называюць імёны лепшых «Жанчын года» па выніках аднайменнага конкурсу, у кастрычніку праходзіць Тыдзень маці, а ў снежні арганізацыя актыўна падтрымлівае акцыю «Нашы дзеці», ствараючы свята для тых, каму не стае бацькоўскага клопату. Спецыяльна да 25-годдзя ў Гродзенскай вобласці стартаваў новы праект «Кветка Радзімы», накіраваны на патрыятычнае выхаванне моладзі і адраджэнне славянскіх традыцый.

Саюз аб'ядноўвае больш за 160 тысяч жанчын, аб'яднаных у абласныя, раённыя, гарадскія саветы і суполкі, створаныя на прадпрыемствах, працоўных калектывах і навучальных установах. У планах арганізацыі — пашырэнне міжнароднага супрацоўніцтва. А ў святочны дзень жанчыны БСЖ правядуць справаздачна-выбарную канферэнцыю і адправяцца на канцэрт, дзе актывістаў арганізацыі ўзнагародзяць граматамі не толькі саюза, а і прафсаюза, БРСМ, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Лепшая жаночая арганізацыя Гродзенскай вобласці, напрыклад, атрымае грамату Савета Міністраў, а лепшая арганізацыя Мінска — грамату Мінгарвыканкама ■

**Кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка павіншаваў членаў арганізацыі з 25-годдзем стварэння Беларускага саюза жанчын і пажадаў, каб іх работа была эфектыўнай і плённай, а дома панавалі мір, утульнасць і дабрабыт.**

**«Нароўні з важнейшым прызначэннем быць захавальніцай дамашняга ачага, клапатлівай маці, любячай жонкай беларускім жанчынам дадзена магчымасць рэалізаваць сябе ў прафесійнай сферы і прымаць самы дзейны ўдзел у жыцці краіны. Развіццё жаночага руху, пашырэнне сацыяльнага партнёрства з дзяржаўнымі і грамадскімі інстытутамі маюць вялікае значэнне для павышэння сацыяльнага статусу жанчыны, захавання і папулярызацыі традыцыйных сямейных каштоўнасцей, што асабліва важна ў наш час», — гаворыцца ў віншаванні.**

■ Ну і ну!

# ДА ЧАГО ДАВОДЗІЦЬ РЭЎНАСЦЬ,

## або Як «сапернік» з экрана давёў да забойства

**Дзевяць наступных гадоў 48-гадовай магіляўчанцы давядзецца правесці ў папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Такое рашэнне вынес суд Ленінскага раёна Магілёва за забойства ёю «грамадзянскага» мужа (частка 1 артыкул 139 КК Рэспублікі Беларусь).**

— Усё здарылася пасля таго, як гэта жанчына з сябрам добра выпілі і ляглі спаць пад уключаны тэлевізар, — расказала падрабязнасці **старшы памочнік пракурора вобласці Алена ШУМЕЙКА.** — Сябра заснуў, а калі прачнуўся апоўначы, жанчына паведаміла яму, што ёй спадабаўся мужчына, якога паказвалі па тэлевізары. Той усур'ёз успрыняў гэтую інфармацыю, завязалася бойка, у выніку якой жанчына нанесла яму смяротныя нажавыя раненні ў грудзі. Мужчына памёр на месцы.

Абвінавачаная віну прызнала часткова, паколькі лічыла, што абаранялася ад нападу п'янага чалавека. Аднак суд, улічваючы яе асобу і ўсе абставіны справы, прызнаў жанчыну вінаватай у супрацьпраўным пазбаўленні жыцця іншага чалавека.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by* ■

**У суботу, 17 снежня, з 9 да 12 гадзін адбудзецца сумесная «прамая тэлефонная лінія» Мядзельскага райвыканкама і газеты «Звязда». Званіць па тэл. 801797 55665.**

■ Будзь у курсе!

# Прызначаны дадатковыя цягнікі на святы

**Беларуская чыгунка загадзя прымае меры па забеспячэнні перавозак пасажыраў у дні калядных і навагодніх свят: прызначана больш за 70 дадатковых цягнікоў міжнародных і міжрэгіянальных ліній.**

У міжнародных зносінах будуць дадаткова курсіраваць 40 цягнікоў па найбольш запатрабаваных маршрутах: Мінск—Масква—Мінск, Брэст—Масква—Брэст, Калінінград—Масква—Калінінград і Баранавічы—Масква—Баранавічы.

У міжрэгіянальным кірунку ў навагоднія святы дадатковыя цягнікі прызначаныя па маршрутах Мінск—Брэст— Мінск, Гомель—Мінск—Гомель, Магілёў—Мінск—Магілёў, Гродна—Мінск—Гродна, расказалі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.

Па найбольш папулярных у пасажыраў напрамках у святочныя дні будуць дадаткова курсіраваць цягнікі здвоеным саставам: №708/707 Мінск—Гомель адпраўленнем з Мінска 30, 31 снежня, 1 і 2 студзеня; з Гомеля 31 снежня, 1, 2 і 3 студзеня; №701/702 Мінск—Брэст адпраўленнем з Мінска 2 студзеня, з Брэста 3 студзеня; №716/715 Мінск—Гомель адпраўленнем з Мінска і Гомеля 2 студзеня; №710/709 Мінск—Гомель адпраўленнем з Мінска і Гомеля 30 снежня і 1 студзеня.

Больш падрабязную інфармацыю пра час адпраўлення прызначаных дадатковых цягнікоў можна атрымаць на сайце www.rw.by, а таксама ў чыгуначных касах і па тэлефонах даведачных службаў.

Беларуская чыгунка працягне работу па прызначэнні дадатковых цягнікоў на перыяд навагодніх і калядных свят з улікам росту пасажырапатоку.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by* ■

# ВАЎКІ Ў ПАВІЦЦІ

## Да ліквідацыі воўчай зграі, якая тэрарызуе вёску ў Кобрынскім раёне, падключыліся многія службы

**Некалькі месяцаў таму ў кобрынскіх вёсках Павіцце, Лелікава і суседніх з імі, што размешчаны на мяжы з Украінай, страху нарабіў зубр, які вольна гуляў ды прыбіваўся да розных статкаў кароў. А тут новая, яшчэ большая навала — ваўкі ў прамым сэнсе атакуюць вёску. Раніцай і вечарам у Павіцце павадзіліся хадзіць ваўкі. Ахвярамі драпежнікаў становяцца сабакі.**

Шэрыя нападаюць на вясковых дварнякоў і загрызаюць іх. Расказваюць, што ваўкі забілі каля паўтара дзясятка сабак.

— Нашы людзі бачылі іх ужо ў сваіх дварах — расказвае **кіраўнік справамі Павіццеўскага сельскага Савета Святлана МІЛАШЭЎСКАЯ.** — Нават прачнуцца ранкам і ўбачыць воўчыя сляды каля парога — уяўляеце, які гэта страх? У нас аўтобусны прыпынак знаходзіцца побач з могілкамі, якія амаль злучаюцца з лясным масівам. Цяпер і на прыпынку раніцай стаяць, самі разумееце, не вельмі камфортна. Пасля першых воўчых расправаў над сабакамі дзеці сталі баяцца хадзіць у школу, работнікі сельгаспрадпрыемства — на працу, таму найперш былі прынятыя меры па абароне людзей. Як вучняў у школу, так і мясцовых калгаснікаў возіць транспарт прадпрыемства «Сельгас-Павіцце».

Такое становішча доўжыцца не адзін тыдзень. А ў вёсцы пражывае не менш чым сямёра паляўнічых. Здавалася б: стрэльбы ў рукі — і наперад. Аказалася, што ёсць шмат бюракратычных перашкод у справе знішчэння ваўкоў. Мясцовыя паляўнічыя ўгоддзі знаходзяцца ў арэндзе ў брэсцкага прадпрымальніка. Значыць, вясковыя паляўнічыя, іх калегі з раённага таварыства не могуць арганізоўваць адстрэл самастойна. Лес вакол Павіцця ўваходзіць у памежную зону. Таму страляць у лесе наогул нельга без суправаджэння пагранічнікаў. Пакуль усе службы ўзгадняюць паміж сабой фармальнасці, ваўкі карыстаюцца сітуацыяй і паводзяць сябе зусім нахабна.

Праўда, у апошнія дні да вырашэння праблемы падключыліся ўсе службы. Сітуацыю ўзяў на кантроль старшыня Кобрынскага райвыканкама Аляксандр Зазуля. Арандатар паляўнічых угоддзяў выехаў на месца і падключыў паляўнічых.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Паводле інфармацыі кіраўніка справамі сельвыканкама, ноччу 15 снежня на ваўкоў была арганізаваная засада. У рэйдавай групе, акрамя прафесіяналаў, былі таксама кіраўнік сельгаспрадпрыемства, старшыня сельскага Савета і дырэктар школы. Аб'язджалі вёску некалькі разоў, але ваўкі — драпежнікі разумныя, яны нейкім чынам адчуваючы небяспеку, у тую ноч да вёскі не выйшлі.

**Дырэктар Павіццеўскай школы Аляксандр РАДКОВІЧ** сказаў, што некалькі папярэдніх дзён абстаноўка ў населеным пункце сапраўды была напружанай. Бывала, што бацькі не адпускалі дзяцей зранку, а прыводзілі вучняў самі толькі на другі ўрок. Цяпер, паводле слоў дырэктара, калі вёску фактычна ахоўваюць паляўнічыя, стала больш камфортна.

— У нашай школе знаходзяцца 174 вучні і 28 выхаванцаў дзіцячага садка. І вядома, калектыў школы асабліва зацікаўлены ў спакоі і стабільнасці. Спадзяёмся, што ўсім зацікаўленым службам удасца справіцца з гэтай праблемай, калі не знішчыць воўчую зграю, дык хоць напалохаць шэрых так, каб яны больш не хадзілі ў вёску, — сказаў кіраўнік установы адукацыі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by* ■

■ Грамадская думка

# Сацыялогія апытаннямі не абмяжоўваецца

## Сярод моладзі попыт на гэту спецыяльнасць расце

**Тыя, хто выбірае сацыялогію, звычайна робяць гэта свядома, сцвярджае Мікалай МЫСЛІВЕЦ, намеснік дэкана факультэта давузаўскай падрыхтоўкі, дацэнт кафедры сацыялогіі і спецыяльных сацыялагічных дысцыплін Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, кандыдат сацыялагічных навук, дацэнт.**



***— Як шмат маладых людзей выбірае прафесію сацыёлага, і наколькі яна перспектыўная?***

— У 2002 годзе, калі спецыяльнасць «сацыялогія» толькі адкрылася ў нашым універсітэце, на першы курс былі залічаны 22 студэнты. У далейшым набор павялічваўся, што сведчыла аб росце папулярнасці новай для горада і вобласці спецыяльнасці і аб захаванні стабільнай цікавасці моладзі да атрымання сацыялагічнай адукацыі. На цяперашні момант на гэтай спецыяльнасці ў ГрДУ навучаецца 162 студэнты. Для ўсіх паступленне стала вынікам свядомага выбару. Яны зацікаўлены ў атрыманні глыбокіх прафесійных ведаў і дэманструюць якасці, якія, спадзяюся, дапамогуць ім у далейшым самарэалізавацца ў жыцці.

Дыплом сацыёлага адкрывае перад выпускнікамі ўніверсітэта шырокія перспектывы прафесійнага і кар'ернага росту. Сацыёлагі працуюць ва ўстановах адукацыі і культуры, у навукова-даследчых установах і ў органах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, у галіне рэкламы, у прэсе і на тэлебачанні, у цэнтрах занятасці і ў праваахоўных органах, на прадпрыемствах рэальнага сектара эканомікі. Яны вывучаюць рынкі збыту і спажывецкі попыт насельніцтва, прымаюць непасрэдны ўдзел у ажыццяўленні маніторынгу кадраў, у распрацоўцы і рэалізацыі праграм барацьбы са злачыннасцю, алкагалізмам, наркаманіяй. Многія сацыёлагі становяцца спецыялістамі па сацыяльным кіраванні, сферай прымянення іх ведаў і навыкаў становяцца ўстановы і прадпрыемствы розных формаў уласнасці.

***— Няўжо ўсё так адназначна станоўча?***

— Не. Адным з найбольш вострых для нас пытанняў з'яўляецца размеркаванне выпускнікоў-сацыёлагаў. Існуючы рынак працы, нават у маштабах паўночна-заходняга рэгіёна краіны, досыць шырокі. У выкананні студэнтамі розных даследчых праектаў зацікаўлены многія прадпрыемствы, установы і арганізацыі нашага горада і вобласці. Аднак калі справа даходзіць да дачы выпускнікам канкрэтнага працоўнага месца, партнёры з рэальнага сектара эканомікі, сферы кіравання і іншыя структуры адразу спасылаюцца на адсутнасць у штатным раскладзе пасады сацыёлага. Як вынік — адмова ў прыёме на працу. У той час як менавіта гэты паказчык — працэнт працаўладкаваных выпускнікоў — з'яўляецца адным з вызначальных пры вызначэнні колькасці бюджэтных месцаў для набору на спецыяльнасць на наступны навучальны год.

***— Але ж уладкавацца і працаваць па спецыяльнасці хоць і не ва ўсіх, але ўсё ж атрымліваецца. Чым такія спецыялісты і ўвогуле сацыялогія могуць быць карыснымі грамадству, сацыяльным інстытутам, бізнесу?***

— У штодзённым уяўленні сацыялогія часцей за ўсё асацыюецца з правядзеннем анкетных апытанняў, вывучэннем грамадскай думкі, з паведамленнямі ў сродках масавай інфармацыі аб тым, які працэнт грамадзян думае так, а які — інакш. Хоць на самай справе рэальны дыяпазон даследчыцкіх інтарэсаў сацыёлагаў і іх магчымасцяў значна шырэйшы. Ён не зводзіцца да правядзення масавых апытанняў з мэтай выяўлення меркаванняў людзей па тых ці іншых праблемах.

Дзейнасць сацыёлага вельмі разнастайная. Яна распасціраецца ад збору інфармацыі аб перавагах людзей пры выбары імі таго ці іншага кандыдата ў прэзідэнты краіны да вызначэння найбольш распаўсюджаных спосабаў зарабляць на жыццё, ад вывучэння прычын і наступстваў злачыннасці, беспрацоўя, унутрысямейных канфліктаў да распрацоўкі тэорый, якія тлумачаць асаблівасці выбару гістарычнага шляху таго ці іншага народа, існуючай сістэмы каштоўнасцяў, вызначэння перспектыў будучага... Нягледзячы на ўсю шырыню ахопу розных сфер жыцця сучаснага грамадства, у дзейнасці сацыёлага ёсць свая «разынка»: гэта навука дазваляе не толькі выявіць праблемы, спароджаныя сацыяльным узаемадзеяннем, прааналізаваць, што да іх прывяло, апісаць іх маштабы і формы, але і знайсці шляхі і сродкі іх вырашэння і прапанаваць іх грамадству.

Зварот да сацыялогіі дапамагае рэальна ацаніць як магчымасці, якія дае нам жыццё, так і перашкоды. Яна дазваляе нам зразумець дынаміку сучаснага разнастайнага і вельмі супярэчлівага свету, адэкватна ацэньваць вартасці і хібы любога ладу жыцця і дамагацца сваіх мэт, у якой бы галіне яны ні ляжалі. Перавагі, якія дае сацыялогія, не абмяжоўваюцца сферай асабістага росту, хоць і гэта само па сабе з'яўляецца ў сучасным грамадстве вельмі важным. Гэта інструмент дыягностыкі таго стану, у якім знаходзіцца наша грамадства.

***— Чаму вы вырашылі вывучаць менавіта сацыялогію?***

— Па базавай адукацыі я гісторык. У 1993 годзе скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, потым працаваў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства ў сярэдняй школе, пасля перайшоў на кафедру гуманітарных навук Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Загадчык кафедры, прафесар Лідзія Лук'янава настойліва параіла мне працягваць прафесійна займацца менавіта сацыялогіяй і паступаць у аспірантуру Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Па яе рэкамендацыі я трапіў у вучні да выдатнага чалавека, таленавітага вучонага, педагога з вялікай літары, акадэміка НАН Беларусі, доктара філасофскіх навук, прафесара Яўгена Бабосава. Гэта сапраўды ўнікальная асоба, чалавек, знаёмствам з якім я вельмі ганаруся. Пад навуковым кіраўніцтвам Яўгена Міхайлавіча я паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. А з 2004 года працую ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы.

Хочацца шчыра падзякаваць за падтрымку і садзейнічанне ў рэалізацыі ўсіх нашых сацыялагічных пачынанняў сваім калегам — сталічным сацыёлагам. Асаблівыя словы падзякі хочацца адрасаваць калектыву Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ і яго дырэктару прафесару Давіду Ротману. ЦСПД у гэтыя дні адзначае слаўную дату — 20 гадоў з дня яго стварэння! Гарадзенскія сацыёлагі віншуюць Давіда Генрыхавіча і ўзначалены ім калектыў з юбілеем, жадаючы усім супрацоўнікам здароўя, дабрабыту і квітнення, а таксама новых творчых ідэй, цікавых праектаў і іх паспяховай рэалізацыі!

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# МАРНАЯ МЭТА?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ну і хто выбірае прыёмнік сваім бацькам, якія не ведаюць, як «гугліць» і знаходзіць тое, што патрэбна, у бясконцай прасторы інтэрнэта? Зразумела ж, мы, іх дзеці. Мне з гэтай праблемай прыйшлося сутыкнуцца дзесьці два гады таму. Сярод асноўных сфармуляваных запытаў, дарэчы, пачула такія: «Каб кнопак не было багата і каб быў канал «Культура».

Пачаўся доўгі, на працягу некалькіх месяцаў, пошук прыёмніка, які прымае ўльтракароткія хвалі, бо тая ж любімая маёй матуляй «Культура» вяшчае на 70,4 МГц, а сетка шкалы абсалютнай большасці прыёмнікаў, якія знаходзіліся ў продажы ў крамах Гомеля, адпавядала толькі FM-дыяпазону і пачыналася пасля 88 МГц. Між тым на цану мы з братам таксама звярталі ўвагу, і высветлілася, што яна на даволі прасты прыёмнік з пашыраным дыяпазонам і некалькімі «прыбабахамі» заходзіць за паўмільёна на старыя грошы. Улічваючы, што мы не імкнуліся занадта эканоміць, было не зусім зразумела — за што такія грошы. Іх усё ж такі прыйшлося патраціць. Дарэчы, адзін «наварот» з тых, якія ёсць у матчыным прыёмніку, яна выкарыстоўвае з задавальненнем: слухае запісаную намі на флэш-карту музыку — ацаніла наяўнасць USB-увахода.

## Разбярыцеся з тэрмінамі: «захоўвання» і «гарантыйным»

Наш **пастаянны чытач і падпісчык, гамяльчанін Уладзімір Яўгенавіч ПАШУК** па сумяшчальніцтве аматар радыё. Ён з паразуменнем аднёсся да праблемы адключэння праваднога радыё ў мэтах агульнадзяржаўнай эканоміі сродкаў. Гаворыць, загадзя, яшчэ да адключэння вяшчання, набыў недарагі кітайскі радыёпрыёмнік. І спадзяваўся, што ён будзе спраўна і доўга працаваць. Але ж шчасце цягнулася толькі тры месяцы:

— З 1 жніўня па 6 лістапада працаваў мой прыёмнік. Мне падабалася, што ўвесь дзень можна было слухаць без перапынку. Але ж потым ён зламаўся. Усё бывае ў жыцці. Стаў я шукаць майстэрню. Пагледзеў, што мой гарантыйны тэрмін скончыўся — ён быў толькі 2 месяцы са дня продажу. Звярнуў увагу, што прыёмнік быў выраблены 5 гадоў таму — нядзіўна, што ён «загадаў доўга жыць». Усё ж я думаў, што яго недзе адрамантуюць. Але ж у майстэрнях мне называлі такія сумы! І казалі, што танней купіць новы, чым рамантаваць стары. Паколькі я інвалід другой групы і пенсіянер, раскідвацца грашыма магчымасці няма, пачаў шукаць больш-менш танны. Зайшоў на «Белтэлекам». Там прадаваўся прыёмнік за 18.66. Але ж перш, чым купляць, спытаў пра гарантыю. Адказваюць: 2 гады са дня продажу. Тады пытаю: а які тэрмін захоўвання з дня вырабу? Прадавец паглядзела — таксама 2 гады. Пытаю: а калі ён выраблены? У 2014 годзе. Аказваецца, пратэрмінаваны прадаюць. Дык, кажу, вы ж павінны былі яго адправіць таму, хто пастаўляў. Не стаў набываць, бо мне ж яго ніхто не адрамантуе. Напісаў ім скаргу.

Дарэчы, скарга Уладзіміра Яўгенавіча, былога выкладчыка ўніверсітэта, і стала падставай для разбіральніцтва, а значыць, і гэтага матэрыялу. Тым часам у атрыманым ад паважанай арганізацыі-манапаліста афіцыйным адказе гаворыцца, што «гарантыйны тэрмін захоўвання са дня вырабу — 30 месяцаў, гарантыйны тэрмін службы са дня продажу — 24 месяцы. Паведамляем, што гарантыйны тэрмін захоўвання са дня вырабу не парушаны, бо данае абсталяванне было выраблена ў лістападзе 2014 года (адзнака ў пашпарце радыёпрыёмніка МЭТА 212)».

Калі заўважылі, ёсць пэўнае і важнае разыходжанне ў 6 месяцаў па даце захоўвання. Прадавец у сэрвісным цэнтры Уладзіміру Пашуку адказала, што тэрмін захоўвання са дня вырабу складае 2 гады, а ў афіцыйным адказе пазначана, што ён — 2,5 года.

На словах, без прадастаўлення адпаведнага дакумента, начальнік аддзела прасоўвання паслуг Гомельскага філіяла РУП «Белтэлекам» Аляксандр Данілкоў мяне запэўніў, што тэрмін захоўвання радыёпрыёмніка быў працягнуты — да 30 месяцаў. Каб гэта зрабіць, між іншым, павінна праводзіцца адпаведная экспертыза ў вытворцы.

Пра гэта гаворыцца ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб абароне правоў спажыўцоў»: «Рэалізацыя асобных нехарчовых тавараў, тэрмін службы і (ці) тэрмін захоўвання якіх мінулі (акрамя лекавых сродкаў), можа быць дазволены ў парадку, усталяваным урадам Рэспублікі Беларусь, па выніках правядзення адпаведнай экспертызы гэтых тавараў. Дазвол на далейшую рэалізацыю тавараў, тэрмін службы і (ці) тэрмін захоўвання якіх мінулі, павінны ўтрымліваць указанне на тэрмін, на працягу якога тавары магчымыя да выкарыстання».

Цікава, што прыёмнікі «МЭТА 212» тым часам чамусьці раптам зніклі з продажу ў сэрвісных пунктах «Белтэлекама», у чым пераканаўся і Уладзімір Яўгенавіч асабіста, і мае сябры, якія таксама зацікавіліся яго пакупкай. Між тым мне было прапанавана афармляць пытанні да гэтай арганізацыі выключна праз афіцыйны запыт. Што цяпер і раблю.

Паважанае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Белтэлекам»! Магчыма, наш чытач і Ваш патэнцыяльны кліент першапачаткова памыліўся наконт тэрміну захоўвання прыёмніка, які ён у вас хацеў набыць. Таму, каб удакладніць сітуацыю, просім Вас прадаставіць копію афіцыйнага правядзення экспертызы, якая цяпер дазваляе продаж тавару (радыёпрыёмніка МЭТА 212), — з абавязковым указаннем, калі і кім яна была праведзена. Каб нашы з вамі суайчыннікі былі спакойныя, што сапраўды змогуць па гарантыі адрамантаваць беларускі тавар у яго вытворцы — мінскага прадпрыемства «Прамсувязь».

## Паміж якасцю і таннасцю

Між тым пытаннем, дзе купіць радыёпрыёмнік, «каб быў танны, просты і якасны», задаюцца вельмі многія. На форумах у інтэрнэце павывучала асноўныя патрабаванні пры ажыццяўленні пакупкі. Яны, здаецца, будуць карыснымі і нашым чытачам. На што трэба звярнуць увагу?

✓ Надзейнасць і больш-менш прыстойны вонкавы выгляд.

✓ Вельмі пажадана УКХ-дыяпазон, каб лавіліся «класічныя» станцыі тыпу «Культура» і г.д.

✓ Добры і прыемны гук (у многіх сталых пажылых людзей слых ужо не вельмі добры).

✓ Магчымасць павесіць на сцяну (г. зн., невялікі памер). Увогуле, важныя не толькі габарыты і вага, але і матэрыялы, з якіх прыёмнік зроблены. Напрыклад, для многіх важны ўдаратрывалы пластык, воданепранікальнасць і вільгацеўстойлівасць прыбора.

✓ Сеткавае сілкаванне ў камплексе (каб не толькі ад батарэек).

✓ Добры прыём ад унутранай антэны, кіраванне кнопкамі і памяць каналаў на некалькі радыёстанцый. Трэба, каб зручна было. Накшталт: націснуў-пераключыў.

✓ Асобныя дадатковыя функцыі. Ну, каву ён вам можа і не зварыць, аднак наяўнасць USB-увахода вітаецца. Можа, каму даспадобы будзе і гадзіннік, будзільнік, таймер, падсветка... Але ж любыя «навароты», безумоўна, паўплываюць на цану.

Між тым па кожным з пунктаў са спецыялістамі можна размаўляць асобна і доўга. Гавораць, якасць прыёму лепш правяраць доследным шляхам. Знаўцы раяць быць асцярожнымі і прыдзірлівымі, вывучаючы ў краме тую ці іншую мадэль.

Прадаўцы любяць тыповыя адгаворкі, напрыклад, «у нас тоўстыя сцены», «у нас усталяваны люмінесцэнтныя лямпы», «мы знаходзімся на ніжнім паверсе, а на вуліцы прыёмнік працуе нармальна». Ну, вось і папытаеце дазволу праверыць якасць прыёму па-за «тоўстымі сценамі» і далёка ад лямпаў дзённага святла, якія ствараюць перашкоды. Няхай прадавец сам прадэманструе вам магчымасці мадэлі ў «звычайных» умовах.

Высакаякасны радыёпрыёмнік заўсёды мае добрую ўстойлівасць да перашкод і не будзе трашчаць і хрыпець на адлегласці 2 м ад самай магутнай люмінесцэнтнай лямпы, тоўстыя сценкі і столі не будуць перашкодай для прыёму сігналу. Свіст на кароткіх хвалях павінен насцярожыць, роўна як і трэск ці гуд на сярэдніх і доўгіх хвалях. Адчувальнае шыпенне ў FM-дыяпазоне таксама з'яўляецца прычынай адмовіцца ад сумнiўнай пакупкі.

Дарэчы, на нашу «МЭТУ 212» нараканняў у інтэрнэце дастаткова, але ж у продажы яна не значыцца сёння практычна нідзе, у тым ліку і ў буйных сеткавых крамах. За вочы многія мне казалі, што прыёмнік, кошт якога 18—20 рублёў, з пункту гледжання сур'ёзнай радыётэхнікі — «дзіцячая цацка». Добры прыёмнік, як і добры тэлевізар, танным не будзе!

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ За кадрам

# Героі без імёнаў,

## або Дзве эпохі адной здымачнай пляцоўкі

**По заснежанай дарозе рухаецца танк чэшскай вытворчасці. На бране сядзяць стомленыя немцы. І раптам іх спакой парушаюць стрэлы. Саскочыўшы на зямлю, салдаты разбягаюцца хто куды. Рухавік спыняецца, над танкам узнімаецца клуб чорнага дыму — «саракапятка» трапіла ў цэль...**

На шчасце, падобны сюжэт сёння можна ўбачыць толькі падчас пэўнай ваенна-гістарычнай рэканструкцыі або ў кіно. У прыватнасці, у дакументальнай стужцы, над якой працуе творчая каманда Генеральнага прадзюсарскага цэнтра Белтэлерадыёкампаніі.

На здымачнай пляцоўцы пабывалі карэспандэнты «Звязды». І быццам трапілі ў дзве розныя эпохі. Прычым тыя, якія прадвызначылі сучасны лёс не толькі нашай краіны, а і ўсяго свету.

### АРТЭФАКТЫ ТРАГЕДЫІ

Дакументальны аднасерыйны фільм вяртае ў падзеі Першай і Другой сусветных войнаў. Вайскоўцы 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна, які ажыццяўляе ў нашай краіне пошукавыя работы, на адным з аб'ектаў знаходзяць ваенныя артэфакты. Праваслаўны крыжык, губны гармонік, ручка і каска адсылаюць гледача да падзей той вайны, з якой яны да нас прыйшлі.

Кожны з гэтых прадметаў у свой час належаў канкрэтнаму чалавеку. Апошнія хвіліны яго жыцця можна будзе ўбачыць на вялікім экране. Кім быў гэты герой, аўтары карціны наўмысна не кажуць.

Справа ў тым, што большасць астанкаў, знойдзеных пошукавікамі ў XXI стагоддзі, распазнаць немагчыма. Устанавіць імя дапамагаюць так званыя «смяротныя медальёны» — эбанітавыя капсулы з укладышам, якія ўтрымліваюць асноўныя звесткі аб вайскоўцу. На жаль, сёння такія знаходкі — рэдкасць. Так і застаюцца знойдзеныя салдаты без прозвішчаў. Менавіта ім і прысвечаны фільм «Безыменны батальён».

— Калі гаворка ідзе пра масавую гібель людзей, мне здаецца, няважна, у якую вайну гэта было: і Першая, і Другая сусветная — жудасныя падзеі, ахвярамі якіх сталі мільёны чалавек, — гаворыць адзін з аўтараў сцэнарыя Ганна Ваганава. — Гэты фільм не проста пра герояў Першай і Другой сусветных войнаў. Людзі, якія сёння займаюцца пошукамі палеглых воінаў і ўвекавечваннем іх памяці, — таксама героі.



Фота Надзеі БУЖАН.







Маладая сцэнарыстка, якая толькі дэбютуе ў дакументалістыцы, лічыць, што аб тых падзеях яшчэ не ўсё сказана. Ды і ў сітуацыі, калі многія гістарычныя факты скажаюцца, а гісторыя ўвогуле перапісваецца, варта нагадаць аб трагедыі, якую перажыў у тым ліку беларускі народ.

### СХІЛЯЮЧЫ ГАЛОВЫ ПЕРАД ПОДЗВІГАМ

Суаўтар сцэнарыя Руслан Туркоў да гістарычнай тэматыкі нераўнадушны яшчэ з дзяцінства. Будучы падлеткам, ён проста зачытваўся кнігамі аб Другой сусветнай вайне. І відаць, нездарма: у яго творчай скарбонцы — больш як 300 дакументальных фільмаў.

— Добра знаходзіцца ў тым асяроддзі, у якім ты сябе адчуваеш як рыба ў вадзе, — перакананы Руслан Туркоў. — Тэма кінастужкі мне блізкая яшчэ і таму, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны загінулі два мае дзяды. Дзе знаходзяцца іх магілы, для маёй сям'і пакуль загадка. Спадзяюся, што калі-небудзь мне ўдасца высветліць, як абарваўся іх лёс. Здымаючы дакументальны фільм на гэтую тэму, мы аддаём даніну памяці, схіляем галовы перад подзвігам нашых дзядоў, у тым ліку тых, хто і дагэтуль лічыцца зніклым без вестак.

Аўтары сцэнарыя запэўніваюць, што фільм будзе цікавы розным пакаленням. Асабістыя гісторыі салдат цесна пераплецены з эпізодамі баявых дзеянняў. Рэалістычнай карціну робяць ваенная тэхніка, аўтэнтычная форма вайскоўцаў розных часоў і армій.

Эпізоды ваенных баталій дапамаглі аднавіць прафесійныя рэканструктары. Учора яны былі салдатамі Першай сусветнай вайны, сёння — Вялікай Айчыннай. Хоць прамежак паміж войнамі невялікі, адрозненне адчуваецца ва ўсім.

— Падчас Першай сусветнай вайны тактыка вядзення бою была іншай у параўнанні з Вялікай Айчыннай, — кажа **камандзір і кіраўнік ваенна-гістарычнага клуба «Салдаты Перамогі» Юрый ПЕРАПЕЧЫН.** — Можна сказаць, нават больш адкрытай. Калі салдат Першай сусветнай мог падняцца з акопа і ісці ў поўны рост, то воін Другой сусветнай вымушаны быў больш поўзаць, чым хадзіць, бо мацней перажываў за сваё жыццё.

### УЛІЧЫЦЬ КОЖНУЮ ДРОБЯЗЬ

Здымаць гістарычныя карціны яшчэ і надзвычай складана. Трэба ўлічыць усе дэталі, ажно да гузіка на мундзіры салдата. Але калі за справу бяруцца прафесіяналы, за рэалістычнасць можна быць спакойным.

За вобразы герояў у кінастужцы адказвае **мастак-стыліст праекта Дзіяна СЛІНКО-СІГОВА.** Каб зрабіць іх праўдападобнымі, перш чым узяцца за справу, яна чытае гістарычную літаратуру, раіцца з гісторыкамі, экспертамі. А каб створаныя яе рукой шрамы і раны ў кадры былі рэалістычнымі, яна вывучае пластычную анатомію.

— Падмануць гледача вельмі проста, таму варта валодаць шматлікімі нюансамі, — лічыць мастак-стыліст. — Напрыклад, разумець, калі насіўся той ці іншы ўзор ваеннай формы, якія ўзнагароды прысвойваліся ў канкрэтны перыяд часу. А вы ведаеце, напрыклад, што чым вышэйшы чын, тым даражэйшыя абутак і рукавіцы? Разумны глядач заўважыць кожную дэталь. І гэта датычыцца не толькі вобразу герояў.

— Здымаць на гістарычную тэматыку вельмі цікава, — прызнаецца **рэжысёр дакументальнага фільма «Безыменны батальён» Юрый ДАБРОЎ.** — Сучасны глядач настолькі спакушаны вялікім аб'ёмам інфармацыі, што яго цяжка чым-небудзь здзівіць. Але мы паспрабуем. Хоць бы тым, што вырашылі паказаць лёсы салдат не толькі з розных эпох, а і з акопаў.

Наколькі рэалістычна ўдалося ўзнавіць найбольш трагічныя падзеі мінулага стагоддзя, можна будзе пабачыць у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» увечары 21 снежня.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*


## «ЗВЯЗДА» НА СВЯТЫ ДОРЫЦЬ... СУВЯЗЬ!

**А што, як не сувязь, самае галоўнае сёння ў адносінах паміж людзьмі? Зыходзячы з гэтага меркавання, мы ў якасці прызоў для розыгрышу сярод падпісчыкаў гэтым разам прапануем прылады для камунікацыі з блізкімі людзьмі і з усім астатнім светам — тэлефоны і планшэт.**

**Тэлефонам сёння нікога не здзівіш, але тут мы падумалі найперш пра нашых сталых чытачоў і пра маладзейшых, якія клапоцяцца аб сваіх бацьках. Зручная клавіятура з вялікімі, добра відочнымі кнопкамі, вялікі экран, дзве SIM-карты — выдатны падарунак для старэйшага ў вялікай і дружнай сям'і. Не забыліся і пра малодшых — галоўны прыз рэкламнай гульні — сучасны планшэт, які падтрымлівае сувязь фармату 4G і мае шмат іншых цікавых і патрэбных функцый.**

**Каб стаць удзельнікам розыгрышу гэтых патрэбных падарункаў, варта толькі аформіць падпіску на газету «Звязда» на I квартал або I паўгоддзе, запоўніць адзін з купонаў, якія будуць змяшчацца ў газеце на працягу снежня, выразаць яго і даслаць на адрас рэдакцыі. Магчыма, фартуна абярэ менавіта вас.**

**Выпісвайце «Звязду» — будзьце заўжды на сувязі!**

Планшэт Asus ZenPad 10 Z300CNL-6A025A 000



Мабільны тэлефон Fly FF241 чорны



**Умовы рэкламнай гульні «На сувязі са «Звяздой» змешчаны ў нумары ад 3 снежня.**

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал і 1 паўгоддзе 2017 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)
на I квартал і 1 паўгоддзе 2017 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ________ (індэкс) ____________________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

# ЧЫТАЙЦЕ Ў «ЗВЯЗДЗЕ» ЎЖО Ў СТУДЗЕНІ

**Новая рубрыка «Повязь Роду»: філасофія народных традыцый і сімвалаў.**

**Кожны падпісчык «Звязды» атрымае ў 2017-м падарункі — насценны каляндар, каляндар святаў усіх канфесій, каляндар народных святаў, месяцавы каляндар садавода-агародніка.**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# КУРС НА НОВЫ ГОД

**Што: МЕЛАДРАМА «ПАТРАБУЕЦЦА ТАТА НА КАЛЯДЫ»**
**Калі і дзе: 8 канал, 21 снежня ў 14.20**



Нямецкі фільм для ўсёй сям'і рэжысёра Пітэра Кахейна — гэта такая краналъная і ўтульная калядная гісторыя з добрым канцом і празрыстай мараллю, якую рэкамендуецца глядзець, «узброіўшыся» пледам і гарбатай або кавай, а таксама верай у цуды.

...Падчас падрыхтоўкі да Калядных свят у 9-гадовай Лінды заўжды ўзнікала толькі адно жаданне. Найлепшым падарункам для яе сталі б... тата і мама, а калі загадаць зусім смелую мару — то брацік або сястрычка. Карацей, малой хацелася мець нармальную моцную сям'ю. Але з цягам часу дзяўчынка, якая засталася зусім адна пасля гібелі бацькоў, усё больш выразна разумела, што выканаць яе жаданне наўрад ці пад сілу нават Санта-Клаусу — а значыць, трэба не пасаваць перад абставінамі і не спадзявацца на чараўнікоў, а брацца справу ў свае рукі і адшукаць сабе сапраўднага бацьку! І хто б сумняваўся, што падчас гэтых пошукаў бясхітрасную, але ўпартую Лінду чакае мноства прыгод...

**Што: МЕЛАДРАМА «ШУТ І ВЕНЕРА»**
**Калі і дзе: МІР, 22 снежня ў 22.00 і 23 снежня ў 10.45**



І зноў гісторыя пра цуды — але ўжо ў дарослым жыцці. Таленавіты, але няўдачлівы правінцыйны акцёр Уладзімір Мышкін з задавальненнем падпрацоўвае ў навагоднія святы Дзедам Марозам. Зазірнуўшы з мехам падарункаў па чарговым адрасе, ён сустракае Яе — медсястру мясцовай бальніцы Веру, якая ў адно імгненне становіцца для акцёра каханнем і сэнсам усяго жыцця. Але заробак у тэатры — зусім не мяжа мар дзяўчыны, і ў пошуках сапраўды надзейнага, фінансава моцнага сямейнага тылу яна сыходзіць ад Мышкіна да яго аднакласніка — забяспечанага бізнесмена.

У адчаі акцёр з галавой акунаецца ў працу, атрымлівае прапанову зняцца ў кіно і — нечакана прачынаецца знакамітым. Цікава, ці зменіць гэта штосьці ў яго стасунках з каханай?

Што цікава, выканаўцы галоўных роляў паўтарылі лёс сваіх экранных герояў: сямейная пара спявачкі Анастасіі Стоцкай і акцёра Аляксея Сякірына распалася ў многім з-за фінансавых прычын...

**Што: КАМЕДЫЯ «ЗА ДВА КІЛАМЕТРЫ АД НОВАГА ГОДА»**
**Калі і дзе: Беларусь 1, 25 снежня ў 6.35**



Вы працягваеце верыць у магію Новага года? Тады не прапусціце камедыю ад «жаночага» рэжысёра Аксаны Байрак пра тое, што ад нянавісці да кахання — няхай сабе не адзін крок, але ўсяго нейкія там два кіламетры.

Менавіта на такой адлегласці ад дачнага пасёлка з сімвалічнай назвай «Надзея» і за 5 хвілін да Новага года сустракаюцца Тацціяна і Анатоль. Ну, як сустракаюцца — аўто маладой жанчыны, якая едзе да бацькі, каб не застацца на свята самотнай, ламаецца і перагароджвае дарогу машыне Анатоля, які і без таго, мякка кажучы, жанчын недалюблівае. Зразумела, абодва героі не ў захапленні ад сустрэчы — але дайсці да пасёлка ім давядзецца разам. А самае цікавае і важнае пачнецца пасля развітання... ■

## Панядзелак, 19 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.30** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Клуб рэдактараў.
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 13.05 Меладрама «Шукаю мужчыну».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 16.25 Серыял «Сваты-3».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**20.00** «Форум» з Дзмітрыем Бачковым.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**0.10** Дзень спорту.
**0.20 Серыял «Пастка».**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 9.55, 22.20** Тэлебарометр.
**9.05, 18.00 Серыял «Кухня».**
**9.35** Два рублі.
**10.30** Капейка ў капейку.
**11.05, 22.25** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**12.00 Баявік «Кілеры».**
**13.45 Серыял «Косці».**
**17.25 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**19.15** Суперлато.
**20.05** Рэпарцёр.
**20.55** «Вяселле ўсляпую». Рэаліці-шоу.
**22.10** КЕНО.
**23.25** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці-шоу.
**0.30** «Анлайн 2.0». Скетчкам.

### Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Вяргенікі.
**8.05, 11.15, 21.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.10 «Кліч продкаў». Серыял.**
**9.05, 15.35 «Баязэт». Драма.**
**10.35** М/ф.
**10.50** «Свята далёкай зоркі». Памяці народнага мастака БССР Аскара Марыкса.
**11.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**12.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.55, 21.20 «Угрум-рака». Драма. 1-я серыя «Грамавы».**
**14.20** «Франтавыя гісторыі любімых акцёраў». Юрый Нікулін. Уладзімір Этуш.
**14.55, 20.00** «Другая сусветная: выпадковая вайна». «Міф аб фюрэры».
**17.05, 22.40** «Камертон». Максім Аверын.
**17.30** «Сустрэчы ў Буквае-дзе».
**19.00** «Гісторыя Беларусі».
**19.10 «Пацалунак Сакрата». Дэтэктыў. «Праклён Эдварда Мунка». 1-я серыя.**
**20.40** «Калыханка».
*На тэлеканале «Беларусь 3» па Брэсцкай і Гомельскай абласцях з 19 па 23 снежня 2016 г. з 19.00 да 20.00 будуць трансляваццa абласныя тэлепраграмы.*

### Беларусь 5

**7.35, 18.35** PRO спорт. Навіны.
**7.45** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. ЦСКА (Масква) — «Хімкі» (Маскоўская вобл.).
**9.25** Хакей. Турнір чатырох нацый. Славакія — Беларусь.
**11.20** Хакей. Турнір чатырох нацый. Швейцарыя — Францыя.
**13.15** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Енісей» (Краснаярск) — «Цмокі-Мінск».
**14.55** Хакей. КХЛ. «Металург» (Новакузнецк) — «Дынама-Мінск».
**17.10** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове Месца. Спрынт. Мужчыны.
**18.45** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове Месца. Спрынт. Жанчыны.
**20.15** PRO спорт. Вынікі тыдня.
**21.00** Хакей. КХЛ. «Металург» (Новакузнецк) — «Дынама-Мінск».
**23.00** «Два бакі алімпійскага медаля». Джавід Гамзатаў.
**23.30** «На шляху да ЧС-2018». Відэачасопіс.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!»
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Адваротны адлік». «Два жыцці Надзеі Грэкавай». Фільм першы.
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15** «Міс Свету 2016».
**23.45** «Голас». Спецыяльны выпуск.
**2.20** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.25** «Вялікае снеданне».
**10.05** «Далёкія сваякі».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50 Маст. фільм «Белыя росы. Вяртанне».**
**15.55 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Вялікі горад».
**18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Глядзець усім!»
**20.40** Музычнае шоу «Дзве зоркі» на СТБ. Новы сезон. Рэдкія кадры.
**23.05** «Тайны Чапман».
**23.55** «Ваенная тайна».

### МІР

**6.00 Маст. фільм «Адзінокім даецца інтэрнат».**
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Серыял «Брэжнеў».**
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Маст. фільм «Прага помсты».**
**16.15** «Мой лепшы сябар».
**17.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**19.20 Серыял «Даішнікі».**
**22.00 Маст. фільм «Варэнне з сакуры».**
**23.45 Маст. фільм «Любімы Раджа».**
*2.00 — Прафілактыка.*

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** Ток-шоу «Што адбываецца».
**12.45** «Пакой смеху».
**13.35** «Наша справа».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Бедныя сваякі».**
**19.10, 20.40 Серыял «Па гарачых слядах».**
**21.45, 23.10 Серыял «Свая чужая».**
**23.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.25** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Лясніk».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**15.05** «Ты не паверыш!»
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Мент у законе».**
**23.10** «ЧП.by».
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00** «Пазнякоў».
**0.10 Серыял «Марскія д'яблы».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Васьмым».
**11.00 Фантастыка «Вайна светаў».**
**13.00 Серыял «У кожнага свая вайна».**
**14.00** «Калядныя сакрэты».
**14.25 Прыгоды «Ледзяныя дрыжыкі».**
**15.55, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад». «101 далмацінец».
**17.10** «Хатняя крама».
**17.40 Серыял «Ключы ад бездані».**
**18.35 Серыял «Падмані мяне».**
**19.25 Серыял «Флэш».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Сутыкненне».**
**23.10 Серыял «Ганібал».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Вароніны».
**9.40** Фэнтэзі «Незвычайныя прыгоды Адэль».
**11.40, 17.00** «Уральскія пельмені».
**12.50** «Паспець за 24 гадзіны».
**13.50** Меладрама «Хатняя прыслужніца».
**15.50, 19.10** Серыял «Вечны водпуск».
**20.20** Серыял «Атэль Элеон».
**21.30** Камедыя «Трое ў каноэ».
**23.40, 4.30** Серыял «Тут нехта ёсць...»
**1.30** Серыял «Бязмоўны сведка».
**3.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.00** «Лаві момант».

### Культура

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15** «Назіральнік».
**11.15** «Бібліятэка прыгод».
**11.30** «Мегрэ расстаўляе пасткі». Маст. фільм.
**13.30** «Пешшу...» Масква Урубеля.
**14.05** «Лінія жыцця». Аляксей Краўчанка.
**15.10** «Дарагая». Маст. фільм.
**17.10** Сусветныя скарбы.
**17.30** Музычныя падзеі года. 150 гадоў Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П.І. Чайкоўскага.
**18.45** «Адлюстраваны час». Дак. серыял.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Саці. Нясумная класіка...»
**20.45** Ступені цывілізацыі. «Бляск і слава Старажытнага Рыма». Дак. фільм. 1-я серыя.
**21.35** Да 90-годдзя з дня нараджэння Яўгена Ташкова. «Астравы».
**22.15** «Рэгтайм, або Разарваны час». Фільм першы. «Асаблівы Гарэлаў».
**22.45** «Энігма». Надзя Міхаэль».
**23.25** Колер часу. Батычэлі.
**23.55** Мастсавет.
**0.00** «Кінескоп». Прэмія Еўрапейскай кінаакадэміі.
**0.40** «Канструктывісты. Вопыты для будучыні. Родчанка». Дак. фільм.
**1.35** «Бенедыкт Спіноза». Дак. фільм.
**1.40** М. Тарывердзіеў. Канцэрт для скрыпкі з аркестрам.
**2.10** «У сцен Масквы». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00, 0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1983. 2009 год.
**7.35** «Зямля—Паветра». Сяргей Пенкін. 2003 год.
**9.00** «Быў час». 2008 год.
**10.00** Тэлеспектакль «Малы і Карлсан, які жыве на даху». 1971 год.
**11.30, 12.50, 14.05, 14.50, 17.05, 18.50, 21.40, 23.00, 2.20, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.
**12.00** Фільм-канцэрт Марылі Радовіч «Фатаграфія ў ліпені». 1987 год.
**13.00** «Пра ката...» Маст. фільм.
**14.20** «Ранішняя пошта». 1989 год.
**15.00** Маст. фільм «Безыменная зорка».
**17.30** Маст. фільм «Пары».
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Падольскі рок-фестываль». 2005 год.
**19.00** Тэлеспектакль «Спяшайцеся рабіць добра». 1982 год.
**21.00, 3.00** «Мінулы час».
**22.00** «Народжаны ў СССР».
**1.40** «Кінапанарама». «Ганна Маньяні». 1983 год. 1-я частка.
**4.00** «Колба часу».

### EuroSport 1

**7.00, 12.30, 18.15, 23.00, 2.20** Снукер. Scottish Open. Фінал.
**8.45, 16.30, 19.45** Горныя лыжы. Кубак свету.
**9.30** Зімовыя віды спорту.
**10.30, 15.30** Біятлон. Кубак свету.
**11.30, 14.30, 17.15, 21.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**0.15** Футбол. «ФІФА».
**0.45** Watts.
**1.00** «Найлепшае з коннага спорту».
**1.20** Конны спорт. Кубак свету.

### Кінакамедыя

**1.05** Камедыя «Леа і Беа». 1-я серыя.
**2.40** Камедыя «Леа і Беа». 2-я серыя.
**4.15, 14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**4.30** Меладрама «Амелі».
**6.40** Драма «Душэўная кухня».
**8.30** Камедыя «Месяцовая афёра».
**10.15** Камедыя «Праклён нефрытавага скарпіёна».
**12.05** Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».
**14.00, 14.50, 15.35** Скетчкам «Паміж намі».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Меладрама «Звычка расставацца».
**17.40** Камедыя «Дарослая дачка, або Тэст на...»
**19.30** Камедыя «Забойны футбол».
**21.25** Камедыя «Лорд Дракон».
**23.15** Камедыя «Шайбу! Шайбу!»

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.30** «Доктар І...»
**8.05, 18.55, 2.50** «Асколкі». Серыял.
**9.40** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.20** «Асцярожна, махляры!»
**11.55** «Без падману».
**12.45** «Канікулы строгага рэжыму». Камедыя.
**14.55** «Дзевяностыя».
**15.50** «Містыка адносін».
**16.55** «Вундэркінды: гора ад розуму». Дак. фільм.
**17.50** «Тайны следства». Серыял.
**20.45, 2.00** «Ежа, я люблю цябе».
**21.45** «Рэвізора».
**22.50** «Развітанне».
**23.40** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.25** «127 гадзін». Драма.
**4.20** «Нераскрытыя тайны».
**5.05** «Часова даступны».

### ТБ1000

**6.10, 14.20** Меладрама «У чаканні вечнасці».
**8.10** Драма «Герцагіня».
**10.05** Трылер «Яна яго абажае».
**11.55** Фантастыка «Блізкія кантакты трэцяй ступені».
**16.00** Меладрама «Знесеныя ветрам».
**20.10** Камедыя «Бі і крычы».
**22.00** Фэнтэзі «Уладар пярсцёнкаў: брацтва пярсцёнка».
**1.00** М/ф «Труп нявесты».
**2.15** Трылер «Улада страху».
**4.10** Трылер «Нічога асабістага».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Горка! 2».
**8.20** Драма «Уцёкі за марай».
**10.10** Баявік «Мантана».
**12.10** Драма «Прорва».
**14.20** Драма «Каробка».
**16.20** Баявік «Мальтыйскі крыж».
**18.20** Меладрама «Пасажырка».
**20.20** Камедыя «Адзінокі па кантракце».
**22.20** Камедыя «На мора!»
**0.20** Драма «Сухадол».
**2.00** Драма «Барцу не баліць».
**3.50** Мюзікл «Стылягі».

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.
**6.25, 12.55** Навуковыя недарэчнасці.
**7.15, 13.45, 21.00, 0.55, 4.15** Антарктыка.
**8.05, 14.30, 21.50, 1.45, 5.05** Гады небяспечнага жыцця.
**9.00, 16.55** Марс.
**10.40** Шаша праз пекла.
**11.25, 15.25** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.10** 80-я. Найвялікшыя футбольныя моманты.
**16.10, 19.25, 23.20, 3.25** Расследаванні авіякатастроф.
**18.35, 2.35** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.
**20.15** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**22.40** Зорная размова 2.
**0.10** Эвакуацыя Зямлі.

### Discovery

**8.00, 14.00** На краі Аляскі.
**9.00, 21.30, 5.55** Як гэта ўтроена?
**9.30, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Бітвы за кантэйнеры.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**11.00** У пошуках скарбаў.
**12.00** Выжыць разам.
**13.00** Выжыванне без купюр.
**15.00** Гарады жывыя і мёртвыя.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Гульня на жыццё.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 4.40** Самагоншчыкі.
**2.00, 6.20** Горш не бывае.

## Серада, 21 снежня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.40** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.00** Зона Х.
**9.10, 22.15 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00, 20.00 Серыял «Жаночы доктар-2».**
**12.10, 16.25 Серыял «Сямейныя меладрамы-6».**
**13.20** Дзень у вялікім горадзе.
**14.20** Дзіцячы доктар.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Серыял «Маскоўскі дэкамерон».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.20** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** «Безыменны батальён». Дак. фільм.
**0.55** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 22.05** Тэлебарометр.
**9.05, 18.10 Серыял «Кухня».**
**10.10, 17.20 Дэтэктыў «Такая работа».**
**11.00, 20.20** «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
**12.05, 16.25 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**13.00, 19.15** «Ікона стылю». Fashion-шоу.
**14.10** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.00, 23.20** «Анлайн 2.0». Скетчкам.
**19.15** «Ікона стылю». Fashion-шоу.
**21.25 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**22.00** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**22.10** «Як гартаваўся стайл». Сіткам.
**23.50 Серыял «Косці».**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 12.00** «Беларуская кухня». Смятаннік. Таплёнае малако.
**8.00, 11.20, 21.00** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 18.10 «Кліч продкаў». Серыял.**
**9.05, 15.35 «Баязэт». Драма.**
**10.40** М/ф.
**10.50** «Свята далёкай зоркі». Памяці народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава.
**11.35** «Наперад у мінулае».
**12.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**12.55, 21.20 «Угрум-рака». Драма. «Здрада».**
**14.05** «Майстры і куміры». Народная артыстка Беларусі Вольга Клебановіч.
**14.55, 20.00** «Другая сусветная: выпадковая вайна». «Гангстары і джэнтльмены».
**17.05, 22.25** «Дыя@блог». Пра прыгожае.
**17.30** «Сустрэчы ў «Буквавудзе».
**19.00** «Гісторыя Беларусі».
**19.10 «Пацалунак Сакрата». Дэтэктыў. «Праклён Эдварда Мунка». 2-я серыя.**
**20.40** «Калыханка».

### Беларусь 5

**7.45, 19.20, 21.50** PRO спорт. Навіны.
**7.55** Спорт-кадр.
**8.25** Авертайм.
**8.55** «Два бакі алімпійскага медаля». Джавід Гамзатаў.
**9.25** Валейбол. Кубак ЕКВ. 1/32 фіналу. Матч у адказ. «Будаўнік» (Беларусь) — «П'ячэнца» (Італія).
**11.30** Баскетбол. Еўраліга. «Алімпіякас» (Грэцыя) — «Црвена Звезда» (Сербія).
**13.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 6-ы тур. «Рэал» (Іспанія) — «Барусія» (Дортмунд, Германія).
**15.05** Козел пра футбол.
**15.25** Хакей. КХЛ. «Сібір» (Навасібірск) — «Дынама-Мінск».
**17.40** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове Месца. Масстарт. Мужчыны.
**18.30** Біятлон. Этап Кубка свету. Нове Месца. Масстарт. Жанчыны.
**19.25** Слэм-данк.
**19.55** Хакей. КХЛ. «Сібір» (Навасібірск) — «Дынама-Мінск».
**22.00** Баскетбол. Еўраліга. «Макабі» (Ізраіль) — ЦСКА (Расія).

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Навіны.
**6.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор».
**12.10** «Сам-насам з усімі».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.15** «Пра каханне».
**15.10, 16.20** «Час пакажа».
**16.55** «Давай пажэнімся!»
**18.20** «Бесталковыя нататкі».
**18.55** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Выйсці замуж за Пушкіна».**
**23.00** «Вячэрні Ургант».
**23.40** «Давай пажэнімся!»
**0.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман».
**9.30, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**10.40** «Сямейныя драмы».
**11.40** «Не хлусі мне!»
**12.35, 17.35** «Званая вячэра».
**13.50** «Тэрыторыя памылак».
**15.30 «Следакі». Серыял.**
**16.50** «Аўтапанарама».
**17.10** «Ведай нашых!»
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**22.00** «Глядзець усім!»
**0.00 «Джокер». Серыял.**
**1.40** Дакументальны праект: «Касмічныя драпежнікі».

### МІР

**6.00** М/ф.
**7.30** Добрай раніцы, свет!
**9.00 Маст. фільм «Шчыт і меч», 3—4-я серыі.**
**12.00, 3.05** «Любімыя акцёры».
**12.30** «Цяжар абеду».
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15 Серыял «Даішнікі».**
**14.05, 19.20 Серыял «Даішнікі-2».**
**16.15** «Мой лепшы сябар».
**17.15 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**22.00 Маст. фільм «Мужчына ў маёй галаве».**
**0.10 Маст. фільм «Дванаццаць крэслаў».**
**3.35 Серыял «Невідзімкі».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.15** «Правілы жыцця».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.40** «Прамы эфір».
**17.20 Серыял «Бедныя сваякі».**
**19.10, 20.40 Серыял «Па гарачых слядах».**
**21.45, 23.10 Серыял «Сваячужая».**
**23.40** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Новая раніца».
**7.25** «Студыя Юліі Высоцкай».
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.20 Серыял «Ляснік».**
**12.00** Суд прысяжных.
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Хвост».**
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.05** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Мент у законе».**
**23.10** «ЧП.by».
**23.30** «Вынікі дня».
**0.00 Серыял «Марскія д'ябли».**

### 8 канал

**7.00** Раніца на «Восьмым».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Прыгоды «Палёт Фенікса».**
**13.00 Серыял «У кожнага свая вайна».**
**13.50** «Хатняя крама».
**14.20 Меладрама «Патрабуецца тата на Раство».**
**15.55, 19.20, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**16.00** «Мультпарад». «Усе сабакі святкуюць Раство».
**17.10 Серыял «Ключы ад бездані».**
**18.00 Серыял «Падмані мяне».**
**18.50** «Мой любімы гадавалец».
**19.25 Серыял «Флэш».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Камедыя «Пастка для бацькоў».**
**23.10 Серыял «Ганібал».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.20** М/ф «Фіксікі».
**7.50** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.10** «Ералаш».
**8.30, 18.00** Серыял «Варонiны».
**9.40** Меладрама «Шэкспіру і не сніласяся».
**11.40, 14.40, 20.20** Серыял «Атэль Элеон».
**12.50** «Паспець за 24 гадзіны».
**14.00** Серыял «Дах свету».
**15.50, 19.10** Серыял «Вечны водпуск».
**17.00** «Уральскія пельмені».
**21.30** Камедыя «Кракадзіл Дандзі».
**23.30, 4.30** Серыял «Тут нехта ёсць...»
**1.20** Серыял «Бязмоўны сведка».
**3.20** Скетч-шоу «6 кадраў».
**4.00** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15** «Інспектар Гул». Маст. фільм. 1-я серыя.
**12.25** «Гюстаў Курбэ». Дак. фільм.
**12.35** «Правілы жыцця».
**13.00** «Энігма. Надзя Міхаэль».
**13.40, 0.00** «Людзі і манекены». Маст. фільм.



**15.10** «Бляск і слава Старажытнага Рыма». Дак. фільм.
**16.05** Штучны адбор.
**16.45** «Кінескоп». Прэмія Еўрапейскай кінаакадэміі.
**17.30** Музычныя падзеі года. Першы Міжнародны Далёкаўсходні фестываль «Марыінскі».
**19.05** «Стэндаль». Дак. фільм.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Абсалютны слых».
**20.45** Ступені цывілізацыі. «Раскрыццё тайн Вавілона». Дак. фільм. 1-я серыя.
**21.35** Улада факта. «Казакі: паміж службай і воляй».
**22.15** «Рэгтайм, або Разарваны час». «У пошуках чалавека. Андрэй Сахараў».
**22.45** 120 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Ракасоўскага. «Генерал Кінжал, або Зорныя гадзіны Канстанціна Ракасоўскага». Дак. фільм.
**23.30** Колер часу. Жорж-П'ер Сёра.
**23.55** Мастсавет.
**1.20** «Гіём Апалінэр, які скраў «Джаконду». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым. «Падольскі рок-фестываль». 2005 год.
**6.50, 9.40, 11.00, 12.50, 14.45, 15.40, 17.00, 18.55, 20.40, 21.40, 23.00, 0.50, 2.05, 2.50, 5.05** Музычная настальгія.
**7.00** Тэлеспектакль «Спяшайцеся рабіць дабро». 1982 год.
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Міжрэгіянальная дэпутацкая група». 2005 год.
**13.10** Маст. фільм «Печкі-лавачкі».
**18.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. 2007 год.
**19.10** Маст. фільм «Хлапчукі».
**0.00** Фільм-канцэрт Марылі Радовіч «Фатаграфія ў ліпені». 1987 год.
**1.00** «Пра ката...» Маст. фільм.
**2.20** «Ранішняя пошта». 1989 год.
**3.00** Маст. фільм «Безыменная зорка».
**5.30** Маст. фільм «Пары».

### EuroSport 1

**3.30, 9.00, 1.05** Снукер. Scottish Open. Фінал.
**5.00, 7.00, 12.30, 17.00, 19.45, 23.00** Горныя лыжы. Кубак свету.
**5.45, 10.30, 18.15, 2.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету.
**11.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету па гонках на вынослівасць.
**14.30, 20.45, 23.45** Фрыстайл. Кубак свету.
**19.15** Watts.
**22.00** Біятлон. Кубак свету.

### Кінакамедыя

**0.50** Драма «Настаўнік года».
**2.50** Камедыя «Разбіраючы Гары».
**4.30, 14.00, 14.50, 15.35, 17.40** Скетчкам «Паміж намі».
**4.50** Камедыя «Татулі».
**6.30** Камедыя «Пазнаёмцеся з Уолі Спарксам».
**8.25** Камедыя «Праклён нефрытавага скарпіёна».
**10.15** Камедыя «Забойны футбол».
**12.05** Камедыя «Лорд Дракон».
**14.15, 15.05** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «На кручку».
**17.55** Камедыя «Спатканне».
**19.30** Камедыя «Забі мяне тройчы».
**21.10** Камедыя «Як па маслe».
**22.50** Меладрама «Амелі».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.30, 14.45** «Ёсць адзін сакрэт».
**7.55** «Доктар І...»
**8.25, 18.55, 2.15** «Асколкі». Серыял.
**10.00, 4.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**11.45** «Сляпая».
**12.45** «Варажбітка».
**13.50** «Паралельны свет».
**15.15** «Здзелка».
**15.45** «Натуральны адбор».
**16.45, 21.50** «Рэвізора».
**17.50** «Тайны следства». Серыял.
**20.50** «Магазіна».
**22.55** «Лінія абароны».
**23.25** «Звышнатуральнае». Серыял.
**0.10** «Людзі Ікс 2». Фантастыка.
**3.45** «Нераскрытыя тайны».

### ТБ1000

**6.10, 18.05** Фэнтэзі «Буйная рыба».
**8.15** Фэнтэзі «Уладар пярсцёнкаў 2: дзве крэпасці».
**11.15** Меладрама «Адна сустрэча».



**12.45** Трылер «Урачысты фінал».
**14.20** Трылер «Прыстанак пракляты».
**16.15** Меладрама «Дарагі Джон».
**20.10** Фантастыка «Воблачны атлас».
**23.10** Фэнтэзі «Уладар пярсцёнкаў: вяртанне караля».
**2.30** Трылер «Яна яго абажае».
**4.20** Драма «Герцагіня».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Прывід».
**8.35** Трылер «Калектар».
**10.20** Драма «Слон».
**12.10** Трагікамедыя «Майстэрства жыць у Адэсе».
**14.10** Драма «Weekend».
**16.10** Драма «Іван сын Амура».
**18.45** Камедыя «Адной левай».
**20.20** Меладрама «Як выйсці замуж за мільянера».
**22.10** Драма «Мішэнь».
**1.10** Камедыя «Раскоп».
**2.50** Драма «Уцёкі за марай».
**4.35** Камедыя «Горка! 2».

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.
**6.45, 9.25, 13.15, 17.00, 5.35** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 14.00, 21.00, 0.55, 4.05** Золата Юкана.
**8.40, 14.45, 21.45, 1.40, 4.50** Незвычайныя промыслы.
**10.55** Шаша праз пекла.
**11.40, 15.30** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**12.30** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
**16.15, 19.25, 23.20, 3.15** Расследаванні авіякатастроф.
**18.35, 22.30, 2.25** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.
**20.15** 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
**0.05** Лініі Наска: расшыфравана.

### Discovery

**8.00, 14.00** На краі Аляскі.
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена?
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена?
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Бітвы за кантэйнеры.
**10.30, 16.30, 23.30, 7.35** Паляўнічыя на склады.
**12.00** Металаломшчыкі.
**13.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**17.00, 22.00, 2.55** Махінатары.
**18.00** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**0.00, 3.50** Залатая ліхаманка.
**1.00, 4.40** Самагоншчыкі.
**2.00, 6.20** Горш не бывае.

## Усходні гараскоп на

**АВЕН.** Без вас справы не зрушацца з мёртвай кропкі. А вашы працоўныя вынікі будуць залежаць ад самавалодання і самадысцыпліны. Ёсць шанц стаць энергічным і вельмі прадпрымальным кіраўніком. Практычна ўсё, што вы задумаеце, збудзецца, таму, перш чым загадваць жаданне, паразважайце, што вы сапраўды хочаце атрымаць. Станьце смялейшымі і экстравагантнымі — і будзеце выдзяляцца сярод натоўпу, прыцягваючы погляды патрэбных людзей.

**ЦЯЛЕЦ.** Пачатак тыдня абяцае быць даволі клапотным, аднак да выхадных усё уляжацца, і вы зможаце выдатна адпачыць у добрай кампаніі. У панядзелак будзьце гатовыя да мноства непатрэбных кантактаў. Будзьце больш абачлівымі ў выказваннях, навакольныя могуць аказацца залішне ўспрымальнымі да вашых слоў ці перадаць іх начальству. Не ўздумайце ігнараваць меркаванне калектыву. У сярэдзіне тыдня магчымы новыя знаёмствы. У сераду добра ўладкоўвацца на новую работу, вам будзе забяспечаны хуткі кар'ерны рост.

**БЛІЗНЯТЫ.** Менавіта зараз атрымаеца ажыццявіць тое, пра што даўно марылася. Не бойцеся задаць пытанне, зоркі кажуць, што вы атрымаеце станоўчы адказ. Калі ёсць цікавыя ідэі, то яны будуць запатрабаванымі і прыбытковымі. Тыдзень прынясе новыя знаёмствы і ўражанні. Работы назапасілася вельмі шмат, затое адчуеце сябе незаменным супрацоўнікам. У аўторак і чацвер будуць асабліва паспяховымі даследчыя і творчыя праекты.

**РАК.** Ваша ўдачлівасць напрамую залежыць ад таго, якія адносіны здолееце пабудаваць з уплывовымі людзьмі і непасрэдным начальствам. Атрымаецца заручыцца іх падтрымкай — лічыце, што ўсё ў парадку. У сераду могуць узнікнуць цяжкасці там, дзе вы іх і не чакалі. Звярніце ўвагу на тое, як распараджаецеся сваім часам, магчыма, знойдзеце спосаб яго сэканоміць. У суботу можаце здзейсніць важны ўчынак, які адаб'ецца на найбліжэйшай будучыні. Для пабудовы адносін, прычым не толькі рамантычнага, але і сяброўскага характару, час не самы ўдалы.

**ЛЕЎ.** Упэўненасць у сваіх сілах і небывалую працаздольнасць гэтага тыдня паспрабуйце выкарыстоўваць для пераадолення складанасцяў на рабоце. Пажадана зрабіць гэта максімальна бесканфліктным шляхам, хай нават ён і зойме больш часу. Варта праявіць больш стрыманасці ў сваіх парывах і нацэліць энергію ў вузкае рэчышча, каб не распырашыць яе. Добры перыяд для заняткаў спортам і пачатку рамонту ў доме. Цяпер важна стварыць для сябе камфортнае асяроддзе, якое дазваляе аптымістычна глядзець на свет.

**ДЗЕВА.** Вакол вас вельмі насычанае інфармацыйнае поле, нават сухая паспяваць улічваць новыя звесткі, якія паступаюць з усіх бакоў. Ад аб'ёму выкананай работы будзе залежаць узнагароджанне, якое атрымаеце, але не забывайцеся пра адпачынак, не варта працаваць на шкоду здароўю. Панядзелак і аўторак прыдатныя для вырашэння важных спраў, падпісання дагавораў. У чацвер пачынайце асвойваць новую прафесію, вучыце мовы, гэта можа аказацца падмогай у прасоўванні па кар'ернай лесвіцы.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Паспрабуйце не чапляцца за мінулае, якім бы бліскучым яно ні здавалася. З'явіцца неблагая магчымасць атрымаць поспех адразу ў двух дыяметральна процілеглых кірунках: добра адпачыць і істотна рушыць наперад у справах. У сярэдзіне тыдня магчыма не зусім прыемная размова з начальствам, затое зможаце дамагчыся прымальных для сябе матэрыяльных умоў. У пятніцу будзьце больш уважлівымі і сабранымі, думайце і аналізуйце, перш чым дзейнічаць.



**СКАРПІЁН.** На гэтым тыдні трэба вылучыць з усіх спраў галоўную і з уласцівай вам упартасцю сканцэнтравацца на ёй. Нават самае няпростае пытанне не вытрымае пад вашым напорам. Не прыкладваючы асаблівых намаганняў, зможаце стаць самым абаяльным і прывабным для навакольных. У сераду будзе шанц праявіць сябе на працы з лепшага боку, начальства ацэніць вашы ідэі і нестандартны падыход. У пятніцу не варта хвалявацца па дробязях. У суботу правядзіце больш часу з сям'ёй.



**СТРАЛЕЦ.** Пажадана заняцца вырашэннем сямейных праблем, не паддавайцеся беспадстаўным сумненням. Вам цалкам па сілах стварыць вакол сябе гарманічную абстаноўку і дарыць навакольным людзям цяпло і радасць. У аўторак можа спатрэбіцца парада юрыста або ўрача, звярніцеся да сапраўдных прафесіяналаў. У чацвер паспрабуйце не зацягваць з афармленнем важных дакументаў. Пятніца — удалы дзень для дзелавых сустрэч і вядзення няпростых перагавораў.



**КАЗЯРОГ.** Варта зменшыць абароты ў сваёй дзейнасці і трошкі панізіць планку жаданняў. Залішняя самаўпэўненасць можа толькі нашкодзіць. Паспрабуйце не замыкацца ў сабе і не ператварацца ў пустэльніка. Зносіны вам неабходны, не закрывайцеся ад блізкіх і сяброў. Ваша ідэя, увасобленая ў рэальнасць, пачне прыносіць плён. Можаце адкрыць для сябе новыя творчыя або працоўныя аспекты, але ўлічыце, што для гэтага неабходная цішыня, засяроджанасць і камфортныя абставіны.



**ВАДАЛЕЙ.** Падобна на тое, што надышоў момант, калі варта нешта ў сабе памяняць. Можна пачаць са знешнасці. Прыслухайцеся да голасу інтуіцыі і канчаткова вырашыце, у якім кірунку і з кім вы хочаце ісці па жыцці далей. У панядзелак могуць выпадкова выявіцца даўно зніклыя рэчы. У сераду не варта ладзіць клапотныя справы. Другой паловай тыдня вы можаце распараджацца па сваім жаданні, за выключэннем суботы, калі лепш не адлучацца з дому ці хоць бы вярнуцца крыху раней.



